# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА КРАІНЫ АДСВЯТКАВАЛА СВАЁ 75-ГОДДЗЕ

**Павіншаваць калектыў Нацыянальнай бібліятэкі рэспублікі з 75-годдзем з дня яе заснавання 24 кастрычніка ў Беларускую дзяржаўную філармонію, дзе адбыўся з гэтай нагоды ўрачысты вечар, прыйшлі многія вядомыя людзі, прадстаўнікі ўрада, прафсаюзаў, грамадскіх арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў і проста яе чытачы.**

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Іван Пашкевіч зачытаў прывітанне кіраўніка дзяржавы, міністр культуры Аляксандр Сасноўскі павіншаваў ад імя Савета Міністраў і ўручыў ганаровыя граматы ўрада і міністэрства лепшым работнікам бібліятэкі. Прыйшлі тэлеграмы ад Старшыні ніжняй палаты Нацыянальнага сходу Анатоля Малафеева, міністра замежных спраў краіны Івана Антановіча, пасольстваў многіх дзяржаў, акрэдытаваных у Беларусі, міністра культуры Расіі Наталлі Дзяменцьевай.

Сярод усіх іншых добрых пажаданняў, якія прагучалі ў гэты вечар, самым дарагім і жаданым для калектыву Нацыянальнай бібліятэкі рэспублікі стала, відаць, пажаданне хутчэй пачаць будаўніцтва новага сучаснага будынка. Праект яго па распараджэнню Аляксандра Лукашэнкі і ўрада ўжо распрацоўваецца.

**Вольга ШЧАДРЫНА, БЕЛТА.**